# Канфлікт у п’есе К. Крапівы «Хто смяецца апошнім»

**І. М. Сырамалотава,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры,
дырэктар Хонаўскага дзіцячага сада–сярэдняй школы

**Урок беларускай літаратуры 10 клас**

**Тэма:**Канфлікт у п’есе Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім». Актуальнасць праблем, узнятых у камедыі.

**Мэта**: Знаёмства з часам напісання і гісторыяй пастаноўкі камедыі, падвядзенне вучняў да ўсведамлення спецыфікі сатырычнай камедыі.

**Задачы:**ахарактарызаваць канфлікт п’есы; вызначыць асноўныя праблемы, узнятыя аўтарам у творы; адказаць на праблемнае пытанне;

развіваць навыкі аналізу драматычнага твора, уменне праводзіць сувязь паміж дзеяннямі ў сатырычнай камедыі з канкрэтнымі гістарычнымі праблемамі;

выклікаць цікавасць да асобы драматурга і яго спадчыны, садзейнічаць выхаванню тэатральнага густу вучняў.

**Абсталяванне:** падручнікі, сшыткі, камп’ютары, кластары, карткі.

**Эпіграф**: Добра смяецца той, хто смяецца апошнім*(народная мудрасць).*

**Праблемнае пытанне:** Чаму ў жыцці знаходзіцца месца падхалімству, прыстасаванству, кар’ерызму, паклёпніцтву, пляткарству?

**Міжпрадметныя сувязі:** гісторыя, культуралогія

**Метады**: часткова-пошукавы, праблемны.

**Формы работы:** агульнакласная, групавая, парная, індывідуальная

**Ход урока**

**І. Арганізацыйны момант**

*Настаўнік:* Вітаю цябе, сонца! Вітаю цябе, дзень! Вітаю вас, рабяты, тых, хто, магчыма, сёння не выспаўся, вітаю тых, у каго, мабыць, сёння дрэнны настрой, вітаю тых, хто з нецярпеннем чакае канікул, і, канешне, вітаю тых, хто сёння будзе добра і актыўна працаваць на ўроку.

Усміхніцеся адзін аднаму! Няхай ад усмешкі стане цёпла на душы, няхай яна дапаможа лёгка і радасна працаваць на ўроку. Жадаю ўсім нам поспеху!

**ІІ. Актуалізацыя ведаў**

*Настаўнік:* Скажыце, калі ласка, з творчасцю якога пісьменніка мы пачалі знаёмства на прошлым уроку беларускай літаратуры? *(Кандрата Крапівы)*

У якасці праверкі дамашняга задання, я прапаноўваю вам зрабіць тэставыя заданні на камп’ютарах.

**ІІІ. Праверка дамашняга задання.**

Вучні выконваюць тэставыя заданні ( Дадатак №1)

**ІV. Паведамленне тэмы і мэты ўрока.**

*Настаўнік:* Ну, што ж веды правераны, адзнакі атрыманы, і мне прыемна бачыць, што вы ў добрым настроі. Спадзяюся, што ён захаваецца да канца ўрока.

Сёння, рабяты, мы будзем працаваць над камедыяй кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім». Разгледзім сутнасць канфлікту ў п’есе, высветлім актуальнасць праблем, узнятых у творы.

Запішыце тэму ў сшытку, падумайце і адкажыце, якія задачы нам трэба вырашыць. *(Ахарактарызаваць канфлікт п'есы; вызначыць асноўныя праблемы, узнятыя аўтарам у творы; адказаць на праблемнае пытанне: Чаму ў жыцці знаходзіцца месца падхалімству, прыстасаванству, кар'ерызму, паклёпніцтву, пляткарству?*)

Эпіграфам да нашага ўрока будзе народная мудрасць «Добра смяецца той, хто смяецца апошнім»

**V. Аналіз твора**

<u>*Настаўнік:*</u>Назавіце, калі ласка, год напісання камедыі *( 1939)*

Успомніце гісторыю і скажыце: што гэта быў за час, якая была атмасфера ў 1937 - 1938-я гады?

*(1930-я гады ўвайшлі ў гісторыю як час сталінскіх рэпрэсій і вынішчэння пісьменніцкіх кадраў, нацыянальнай інтэлігенцыі, ідэалагічных рэгламентацый у літаратуры. Панавала атмасфера ўсеагульнай падазронасці, страху, пошуку ворагаў народа.)*

<u>*Настаўнік:*</u> Звярніце ўвагу на дошку. Вы бачыце фотаздымкі, лозунгі, якія, я думаю, нам дапамогуць стварыць атмасферу 30-х гадоў.

У той час характар літаратуры вызначала палітыка партыі і дзяржавы, якая фармулявалася зверху і праводзілася ў жыццё паслядоўна ўсімі грамадскімі і дзяржаўнымі інстытутамі. Таму не дзіва, што шлях на сцэну камедыі «Хто смяецца апошнім» быў нялёгкім. Спачатку твор аб'явілі варожым, паклёпніцкім. Калі тэатр звярнуўся па дапамогу ў ЦК КПБ, тады п'есе не толькі далі дабро, але і ўключылі яе ў рэпертуар Дэкады беларускага мастацтва. Пастаноўка мела вялікі поспех (рэжысёр Леанід Рахленка.) У 1954 годзе камедыя экранізавана (рэжысёр Уладзімір Корш-Саблін.)

Успомніце, калі ласка, які жанр п'есы? *(Сатырычная камедыя)*

Што такое **камедыя** – жанр драматычнай літаратуры, твор, у якім камічна, у смешным выглядзе паказваюцца розныя (часцей адмоўныя) з'явы жыцця з мэтай іх крытыкі.

Прыгадайце, калі ласка, як пачынаецца п'еса? *( Дыялогам цёці Каці і Нічыпара. Яны у размове паміж сабой расказваюць пра супрацоўнікаў інстытута, даюць трапную характарыстыку кожнаму персанажу.)*

Знайдзіце падцвярджэнне ў падручніку.

*( Чарнавус - сапраўдны вучоны; Гарлахвацкі адчувае сябе «як шчупак у сажалцы»: усе перад ім выдыгаюць, а яму і крукам носа не дастаць. Гэта невук, бюракрат, небяспечны для сумленных людзей: «з'есць і Чарнавуса»; Зёлкін – невук, падхалім, пляткар, рагансец, які свядома плаціць жонкай за месца ў інстытуце. Туляга – палахлівец .)*

<u>*Настаўнік:*</u> Да, рабяты, традыцыйны пачатак. У многіх п'есах класікаў на падмосткі выходзяць спачатку слугі і ў размовах характарызуюць сваіх паноў. І вось гэтак жа традыцыйна, а інакш не бывае, п'еса будуецца на канфлікце.

Скажыце, як вы разумееце тэрмін канфлікт? (*Барацьба, сутыкненне*).

Паглядзіце, калі ласка, на карткі, дзе даецца паняцце канфлікту. Зачытайце.

<u>**Канфлікт**</u> – (сутыкненне) – адлюстраваная ў літаратурным творы барацьба, сутычка характараў, якая тлумачыцца процілегласцю або адрознасцю інтарэсаў, пачуццяў людзей. Канфлікт выступае як важнейшы сродак арганізацыі дзеяння,

раскрыцця характараў; будуецца на аснове вострых сутыкненняў паміж станоўчымі і адмоўнымі персанажамі.

<u>*Настаўнік:*</u> Дык у чым жа заключаны канфлікт у камедыі «Хто смяецца апошнім»? *(Дабра і зла: сумленны чалавек – несумленны, невуцтва – адукаванасць; паклёпніцтва, прыстасаванства, кар'ерызм – прынцыповасць.)*

<u>*Настаўнік:*</u> На падставе канфлікту можна сфармуляваць праблемы, якія ўздымае К.Крапіва ў п'есе. Якія праблемы мы можам вылучыць? (*Выкрыццё невуцтва і кар'ерызму – гарлахватчыны, падхалімства, пляткарства – зёлкаўшчыны.)*

Спынімся больш падрабязна на гэтых праблемах і паспрабуем прасачыць як яны раскрываюцца ў камедыі. Папрацуем у групах. Кожная група будзе асэнсоўваць пэўную праблему. Ваша задача – высветліць, якія рысы чалавечага характару выкрывае обо высмейвае пісьменнік. Неабходна запісаць у кластар, адпаведна з тым, над якой праблемай вы працуеце. Патлумачыць, як гэта праблема вырашаецца ў творы. Свой адказ аргументуйце прыкладамі, цытатамі з тэксту п'есы.

Кластар




**Праблема выкрыцця гарлахватчыны.**

<u>*Невуцтва.*</u>Гарлахвацкі не можа адрозніць костку свінні ад карыснага выкапня. Блытае перыяды: пермскі і пензенскі; не ведае гісторыі: свіння ласавалася людзьмі, калі тыя нават не існавалі.

<u>*Кар'ерызм.*</u>Дырэктар інстытута мае сувязі і гэтым карыстаецца; забірае водзыў на работу Чарнавуса для таго, каб паказаць сябе добрым вучоным. Здольны на подлы ўчынак.

<u>*Паклёпніцтва.*</u> Тэлефануе ў выдавецтва, у інстытут, дзе вучыцца дачка Чарнавуса, «каб быў Чарнавус на паслугах…». Карыстаецца такімі метадамі, як шантаж, запалохванне людзей.

*Прыстасаванства.* Гарлахвацкі прыстасоўваецца да змен грамадскага клімату; яго «саслалі на добрае месца» –падладжваецца да сваіх падначаленых, хітруе: з цёцяй Кацяй і Чарнавусам – па-добраму.

**Праблема выкрыцця зёлкаўшчыны.**

Зёлкін – *прыстасаванец*, які імкнецца дагадзіць кіраўніцтву. Такія людзі патрэбны кіраўнікам, і ён гэта ведае. Паводзіць сябе і мяняецца ў адпаведнасці з сітуацыяй. Ён хваліць Гарлахвацкага: «не можа быць, каб вы напісалі такое глупства…»

*Падхалімства* –выяўная рыса ў натуры гэтага персанажа: «Выбачайце, Аляксандр Пятровіч, што я вам думаць перашкаджаю».

Зёлкін *пляткарыць:* « Ты нічога не чуў пра Чарнавуса? Чарнавус сустракаецца з Верай, цалаваліся…». Збірае інфармацыю і стварае плёткі.

*Настаўнік:* Скажыце, рабяты, якія мастацкія прыёмы дапамагаюць аўтару раскрыць канфлікт і праблемы ў п'есе. *(Іронія, гіпербала, камічная сітуацыя, мастацкая дэталь.)*

*Настаўнік:*Мы ведаем, што раскрыць канфлікт і праблемы ў камедыі аўтару дапамагаюць мастацкія сродкі. Давайце вызначым, якімі прыёмамі карыстаецца Кандрат Крапіва? *(Іронія, гіпербала, камічная сітуацыя, мастацкая дэталь.)*

- Скажыце, калі ласка, што такое іронія?

**Іронія** – літаратурны прыём, у аснове якога ляжыць ужыванне слова ў супрацьлеглым значэнні з мэтай высмейвання якой-небудзь адмоўнай жыццёвай з'явы.

- Скажыце, калі ласка, што такое гіпербала?

**Гіпербала** – мастацкі прыём перабольшання ўласцівасцей, якасцей ці памераў прадмета або з'явы з мэтай мастацкай выразнасці.

- Скажыце, што такое камічная сітуацыя?

**Камічная сітуацыя –** гэта тое, што выклікае смех, своеасаблівая эстэтычная форма крытыкі адмоўных з'яў у жыцці і ў мастацкім творы.

- Скажыце, што такое мастацкая дэталь?

**Мастацкая дэталь**–рыса, падрабязнасць у паказе паводзін, апісанні, знешнасці героя, абстаноўкі, пэўны момант у дзеянні твора.

*Настаўнік:* А зараз папрацуем у парах. Кожная пара атрымае картку, дзе пазначаны мастацкі прыём. Ваша задача заключаецца ў тым, каб прывесці прыклады з тэксту дадзеных мастацкіх прыёмаў.

*Іронія*–цёця Кацяй: «Жонка валасы пафарбавала»; Туляга: «Цудоўны чалавек.Свет прайдзі –другога такога не знойдзеш!»; прысуд Гарлахвацкаму выносіць Нічыпар («Костка вам ужо не патрэбна?»)

*Гіпербала* – баязлівасць Тулягі; вобраз Гарлахвацкага.

*Мастацкая дэталь*: цёця Кацяй: « І чаму вы, таварыш Зёлкін, ходзіце так заўсёды, быццам у вас не ногі, а *мяккія лапы*?»; імя Аляксандр Пятровіч у Чарнавуса і Гарлахвацкага; «брэша як наняты» (Гарлахвацкі пра Зёлкіна)

*Камічная сітуацыя*: «Лішнюю плошчу падмятаеце» (размова з цёцяй Кацяй); маналог Зёлкіна пасля даклада: « Бачым, як жывую, ў вобразе»; «свінтус грандыёзус»;

*Роля мастацкіх прыёмаў:* ствараюць каларытныя вобразы, раскрываюць характары герояў, раскрываюць праблемы і г.д.

*Настаўнік:*Мы з вамі вызначылі канфлікт п'есы, праблемы, якія ўзняў пісьменнік у камедыі, мастацкія прыёмы, якія дапамаглі раскрыць канфлікт, і праблемы. Застаецца высветліць, якая асноўная ідэя п'есы «Хто смяецца апошнім». Прапаную

вашай увазе фрагмент фільма. У час прагляду пастарайцеся сфармуляваць ідэю твора. (*Дэманструецца эпізод фільма, калі Лeвановіч раскрывае сутнасць гарлахватчыны.*)

**Ідэя твора:** паставіць чалавека на сваё месца, інакш кажучы, сарваць маску вучонага з невука і паклёпніка, высмеяць падхалімства і прыстасаванства, паказаць, якую шкоду грамадству і навуцы прыносіць кар'ерызм, дэмагогія і невуцтва.

Настаўнік: І вось цяпер мы можам адказаць на праблемнае пытанне: чаму ў жыцці знаходзіцца месца падхалімству, прыстасаванству, кар'ерызму, паклёпніцтву, пляткарству?

*(Вучні адказваюць на праблемнае пытанне, выкарыстоўваючы метад «6 шляп»:* **чырвоная шляпа** – адказвае на пытанне, выказваючы эмоцыі, пачуцці, прадчуванні; **жоўтая шляпа** – адказвае на пытанне, стараючыся знайсці перавагі; **чорная шляпа** – адказвае на пытанне, крытыкуючы і ацэньваючы, указвае на недахопы; **зялёная шляпа** – адказвае на пытанне у рэжыме творчасці, нестандартных падыходаў і альтэрнатыўных пунктаў погляду; **белая шляпа** – адказвае на пытанне, канстатуючы факты; **сіняя шляпа** – падводзіць вынік.)

**Вынік:** Падхалімства, прыстасаванства, кар'ерызм, паклёпніцтва, пляткарства жывуць у атмасферы страху, разгубленасці, палітычнай слепаты. І перастануць гэтыя з'явы турбаваць грамадства толькі тады, калі будзе панаваць сумленнасць, мужнасць, рашучасць. Гэта пытанне актуальна і ў наш час.

**VI. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія.**

- Дык, усё ж такі, хто смяецца апонім? *(Смяецца апошнім той, хто праходзіць праз усе цяжкасці, выпрабаванні, магчыма, нават праз здзекі несумленных людзей, аднак пазней становіцца пераможцам.)*
- Выберыце адну фразу для суседа па парце:
  Ты малайчына.
  Я задаволены тваёй работай на ўроку.
  Ты мог бы папрацаваць і лепш.

**VII. Выстаўленне адзнак.**

**VIII. Дамашняе заданне.**

Падрыхтаваць вусную характарыстыку вобразаў Тулягі, Зёлкіна, Гарлахвацкага ( на выбар.)

**Тэхналагічная карта ўрока беларускай літаратуры**

**Тэма:**Канфлікт у п’есе Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім». Актуальнасць праблем, узнятых у камедыі.

**Настаўнік:** Сырамалотава Ірына Міхайлаўна

**Клас:** 10

**Мэта**: Знаёмства з часам напісання і гісторыяй пастаноўкі камедыі, падвядзенне вучняў да ўсведамлення спецыфікі сатырычнай камедыі;

**Задачы:**Ахарактарызаваць канфлікт п’есы; вызначыць асноўныя праблемы, узнятыя аўтарам у творы; адказаць на праблемнае пытанне;

Развіваць навыкаў аналізу драматычнага твора, уменне праводзіць сувязь паміж дзеяннямі ў сатырычнай камедыі з канкрэтнымі гістарычнымі праблемамі;

Выклікаць цікавасць да асобы драматурга і яго спадчыны, садзейнічаць выхаванню тэатральнага густу вучняў.

**Плануемы вынік урока:** плануецца, што да канца ўрокавучні павінны навучыцца вызначаць асноўныя праблемы, узнятыя аўтарам у творы, бачыць, разумець, характарызаваць канфліктныя сітуацыі, якія раскрываюцца ў п’есе, вызначаць ідэю твора, уяўляць тагачасную гістарычна-палітычную сітуацыю, умець адказаць на праблемнае пытанне: Чаму ў жыцці знаходзіцца месца падхалімству, прыстасаванству, кар’ерызму, паклёпніцтву, пляткарству?

| Этап урока/ выдатка-ваны час | Змест выкладаемага матэрыялу | Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў | Выкарыста-ныяметады і прыёмы | Прагназуемыя вынікі | Абсталяванне |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **I Арганізацыйны момант (1хв)** | Стварэнне добразычлівай рабочай атмасферы | Вітаецца, жадае ўсім поспеху | Слухаюць прывітанне, усміхаюцца адзін аднаму | Матывацый-ная гутарка | Матывацыявучняў на пазнавальнуюдзейнасць, павышэннеціка васці да тэмыўрока | |
| **II Актуалізацыя ведаў (1хв)** | Успамін матэрыялу папярэдняга ўрока | Задае пытанне | Вучні слухаюць, адказваюць на пытанне, настройваюцца на выкананне тэставага задання | Гутарка | Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў з апорай на матэрыял папярэдняга ўрока | Партрэт пісьменніка |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **III Праверка дамашняга задання (4хв)** | Выкананне тэставага задання на камп'ютарах Дадатак №1 | Дае ўстаноўку на выкананне тэста | Выконваюць тэст | Індывідуальная работа вучняў | Вучні замацоўваюць веды па тэме: «Жыццёвы і творчы шлях кандрата Крапівы» | Камп'ютары |
| **IV Паведамленне тэмы і мэты ўрока (2хв)** | Вызначэнне тэмы ўрока, ключавое праблемнае пытанне | Называе тэму ўрока, звяртае ўвагу на эпіграф, агучвае праблемнае пытанне | Запісваюць тэму ўрока ў сшыткі, вызначаюць задачы на ўрок, чытаюць эпіграф | Аналітычная гутарка, прыём «Ключавое пытанне» | Уключэнне вучняў у работу над тэмай, адаптацыя да работы ваўмовах аналітычнай гутаркі | Эпіграф, сшыткі, праблемнае пытанне на дошцы |
| **V Аналіз твора (30хв)** | Работа з гістарычным матэрыялам, са зместам твора, з | Накіроўвае вучняў на ўспамін гістарычнай сітуацыі 1937-1938-я гг, звяртае ўвагу на фотаздымкі і лозунгі, якія | Адказваюць на пытанні, запаўняюць кластары, вызначаюць мастацкія прыёмы, характарызуюць | Эўрыстычная гутарка, групавая работа, | Вызначаюць асноўныя праблемы, узнятыя | Фотаздымкі, лозунгі, падручнік, кластар, |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | літаратурнымі тэрмінамі і паняццямі, характарыстыка персанажаў п’есы, | былі актуальны ў той час, дапамагае ў вызначэнні канфлікту ў п’есе, характарыстыцы праблем, узнятых у творы | праблемы, узнятыя ў творы, вызначаюць канфлікт п’есы , працуюць з тэкстам падручніка, аналізуюць прагледжаны ўрывак кінафільма | работа ў парах, індывідуальная работа | аўтарам у творы, характарызуюць канфліктныя сітуацыі, якія раскрываюцца ў п’есе, вызначаюць ідэю твора, уяўляюць тагачасную палітычную сітуацыю, адказваюць на праблемнае пытанне. | камп’ютар, кінафільм, карткі з заданнямі Дадатак №2, Дадатак №3 |
| **VI Падвядзенне** | Мабілізацыя вучняў на рэфлексію атрыманых ведаў | Звяртаецца да эпіграфа | Адказваюць на праблемнае пытанне і аналізуюць змест | Эўрыстычная гутарка, Метад «6 | Усведамленне выніковасці сваёй дзейнасці | Фразы для суседа па парце |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **вынікаў. Рэфлексія (5хв)** | і пастаўленых мэтаў | | эпіграфа | шляп», самаацэнка | | |
| **VII Дамашняе заданне** (2 хвіл.) | Падрыхтаваць вусную характарыстыку вобразаў Тулягі, Зёлкіна, Гарлахвацкага (на выбар) | Дае якасную ацэнку працы кожнага вучня. Дзякуе за супрацоўніцтва, жадае ім далейшых поспехаў, развітваецца | Запісваюць д/з у дзённікі | Асэнсаванне дамашняга задання | Уменне знаходзіць галоўнае ў тэксце мастацкага твора, аналізаваць, выказваць уласнае ўражанне | Дошка, дзённікі |

ДАДАТАК №1

Тэставае заданне

1. **Сапраўднае прозвішча Кандрата Крапівы**:

а) Іван Дамінікавіч Луцэвіч;

б) Кандрат Кандратавіч Атраховіч;

в) Мікалай Карлавіч Раманоўскі

**2. У ваенны час Кандрат Крапіва пісаў:**

а) памфлеты;

б) вершы;

г) байкі

**3. Кандрат Крапіва нарадзіўся:**

а) у вёвсцы Малая Багацькаўка на Магілёўшчыне;

б) у вёсці Нізок Уздзенскага раёна Мінскай вобласці;

в) у вёсцы Пасадзец на Міншчыне

**4. Укажыце байкі Кандрата Крапівы**:

а) «Дзед і баба»

б) «Махальнік Іваноў»

в) «Дыпламаваны Баран»

**5. Першая п’еса Кандрата Крапівы, напісаная ў 1933 годзе:**

а) «Канец дружбы»

б) «Хто смяецца апошнім»

в) «Мілы чалавек»

**6. Кандрат Крапіва быў мабілізаваны у царскую армію, ваяваў на Румынскім фронце:**

а) 1918г.; б) 1915г; в)1917г

ДАДАТАК №2

**Канфлікт** – (сутыкненне) – адлюстраваная ў літаратурным творы барацьба, сутычка характараў, якая тлумачыцца процілегласцю або адрознасцю інтарэсаў, пачуццяў людзей. Канфлікт выступае як важнейшы сродак арганізацыі дзеяння, раскрыцця характараў; будуецца на аснове вострых сутыкненняў паміж станоўчымі і адмоўнымі персанажамі.

ДАДАТАК №3

